ству патрэбны грошы. Яно накладывае на народ новые падаткі. Праўда, народу і гэтак цяжка. Багата ён і бяз гэтаго плаціць падаткоў, ажно вывярнуцца з іх ня можэ, усё у нядоімцы па вушы сядзіць. Калі дадаць ешчэ новые падаткі, земскіе, дык на першы пагляд можэ выдацца, што толькі лішні ціжар узваліваецца на народные плечы.

Нічога ня зробіш: так званые расходы гэта адна з найбольшых і з найважнейшых патрэб — абыйсьціся без каторых ані німа як· Земства выдае грошы на школы, дактароў, культурные установы, на лепшые дарогі і г. д. Усё гэта такіе справы, што зменшаць выдаткоў на іх ня можна, а наадварот пастаянна трэба павялічываць.

Цяжка народу плаціць падаткі, добра было б іх зменшыць, ды праўду кажучы шмат па якіх расходах нашаго гасударства варта было б зберагчы грошы, варта было б меней выдаваць. Гэта так. Але на культурные патрэбы, памятаючы аб лепшай будучыне роднаго краю, скупіцца з грашамі ня можна. Пры тым і падаткі можна размяркаваць гэтак, каб з багатых збіралося болей, з бедных меней, каб не цяжкі народу яны былі. Ні маючы мейсца затрымлівацца над растлумачэньнем як гэта зрабіць, агранічуся толькі намёкам на тое, што шмат па якіх краёх — падаткі размяркаваны справядлівей—і з бедных не бяруцца без увагі. Можна было бы, гэтак наладзіць справы і у нас,— пры збіраньні як земскіх так і ўселякіх іншых падаткоў.

Падзел земства на губэрнскае і паветовае павінен астацца і пры найлепшым палажаньню земства. Адны справы гэткіх вялікіх вымагаюць коштоў, што паветоваму земству не па сіле—ды значэньне маюць на ўсю губэрню (напр. больш каштоўные школы, мэліорацііі г.д.) а другіе лепей здолее наладзіць паветовые земства. Вось дзеля агульнаго дабра—працу праміж імі трэба падзяліць. Але гэтаго мала. Паветовае земство кіруючае цэлым паветам, дзе жыхароў неколька сот тысячоў, гэтак сама ня ўсё, як трэба, можэ споўніць. Ёсьць гэтакіе справы, каторые маюць значэньне толькі для аднэй воласьці, для невялічкай лічбы людзей. Напр. як пабудаваць мост праз якую рэчку, правясьці канаву і т. п., ды зрабіць гэта ў залежнасьці ад мейсцовых варункаў лепей і таней, — аб гэтым могуць судзіць жыхары тых некалькіх вёсак (ці аднэй нават вёскі) каторым гэты мост, роў патрэбны. Праўда маюць яны гласных выбарных ад сябе у паветовым земстві, але та мака пастанаўляюць справы гласные з усяго павету. Гласные выбранные з гэтай воласьці найлепей знаючы мейсцовые варункі і патрэбы будуць раіць зрабіць адно; а гласным з другіх воласьцей у каторых інакшые патрэбы можэ выдацца іначэй. Яны на гэта могуць ня згодзіцца. У канцы справа выйдзе наладжэнай горэй чымся тады калі б яе упарадкавалі адны толькі мейсцовые людзі. Яны-ж найлепей гэту справу знаюць і жыва зацікаўлены у як найлепшай яе пастаноўцы.

Далей, усякіх дробных спраў на цэлы павет набіраецца гэтак многа, што пры найлепшай ахвоці паветовае земства не пасьпевае усе іх, як сьлед, разглядзець, абмяркаваць, абдумаць. Трэба сьпешацца каб хапіло часу усё гэна разабраць. Ну а вядома сьпешаючыся таго ня ўспомніш, на гэта забудзешся і зробіш сёе ды тое ня гэтак.

Вось і патрэбна земства ешчэ драбнейшае ад паветоваго. Ніхай губэрнскіе земствы разглядаюць адны справы, паветовые другіе, ну а для парадкаваньня дробнымі справамі павінны быць ешчэ адна го сорту земствы — земствы валасные. Гэткаго, дробнаго, валаснога земства у Расеі не заведзена, а яно надта патрэбна. Але аб тым як наладзіць валасное земство пагаворым ужо у чародным раздзелі.

**Лявон Гмырак.**

## Падмогі.

Чытаючы у газэтах, што селяне шмат дзе па вёсках цэлымі сходамі касуюць манапалькі і шынкі, неяк робіцца весялей на душы, родзіцца вера у маладую, ешчэ мала папсутую новымі «веяньнямі», Сілу і Розум Народу...

Селянін сам пачаў пазнаваць скуль бярэцца шкадлівасьць яго жыцьця! Гэта ўсё добра, вельмі добра, толькі трэба ешчэ раз азірнуцца назад ды глянуць на «пачатак пачаткоў ўсіх» — на глаўную прычыну народнаго пьянства, тады і змаганьне куды лягчэй зробіцца.

— Чаму селянін пьець?

— Бо цёмны

— Чаму цёмны?

— Бо пьець.

І так бяз пачатку і без канца.— «Круці н· круці, а трэ памярці»!

Нейкі зачараваны круг...

Ён цёмны — ён ня ведаець якой другой гульнёй насыціць сябе пасьля цяжкой працы чым выпіўка. Яму патрэбна нейкая гімнастыка, рух звязь з людзьмі і.. ён ідзець у карчму, бо другога мейсца німа. Тут настае яго душэўнае жыцьцё, пачынаючы шчырымі пацалункамі добраго прыяцеля і канчаючы бурнымі бойкамі.. Атуманіваюцца яго мазгі і ён ўжо ня ў сілах вырвацца ад свайго паганаго ворага пянства.

Ен пьець, бо цёмны.

Ен цёмны, бо пьець...

Каб гэта зніштожыць трэба ня піці ня быць цёмным.

Вось бачым мы жывые факты, што самі селяне, паўстаюць праціў гэтаго. пачынаюць змагацца, а мейсцамі па вёсках кабеты устраіваюць „м тынгі" аб скасавані прадажы паганай атруты З гэтаго відаць, што „горэ народнае" „бедны наш край затапіло"... далей ўжо нельга дыхнуць і народ крыкнуў": Не дачэкаемся мы — ад „лепшых" братоў сваіх ніякай падмогі; — мы самі павіны ратавацца! Але тут трэба звярнуць увагу на тое, што атказацца ат гарэлкі ешчэ мала; — трэба чым колечы запоўніць астаўшаеся пусто мейсцо у жыцьці селяніна пасьля гарэлкі.

Трэба даць страву, рух і новае жыцьцё яго мазгам і душы... Трэба прыйсці яму на падмогу.

Перш на перш разам с павялічэньнем числа школ і навукі у школах для селянскіх дзяцей, трэба і для сталых устраіваць чытальні, клубы, рабіць спэктаклі, кінэматографы, сьпевацкіе гурткі і інш (не гаворым тут аб вельмі патрэбных коопэратыўных установах).

Трэба устраіваць гульні, танцы, спортавые гурткі для маладзежы.. Калі селянін будзэ мець новую страву для душы, тады можна сказаць напэўна счэзне уся злыбеда нашаго жыцьця.

Мы шчыра верым, што сам народ возьмецца с часам за гэту работу, але цяпер трэба народу паказаць кудой трэба ісці Трэба каб народная інтэлігенція узялася цяпер за працу.

Болей сьветлые, свядомые сыны бацькоўшчыны, цяпер пара ўзяцца за працу!

Цяпер руку аб руку з народам! Гэта праца дасць у скорым часе багатае жніво і народная душа вылечыцца с тых глыбокіх ран, каторые спрадвеку укараніліся у яго душы, дзякуючы варункам у якіх быў пастаўлен народ.

Пры гэтым трэба памятаць, што кожная культурная работа, сярод беларусоў павінна вясціся у беларускай мове, бо ня можна ламаць душы народнай.

*Змітрок Бядуля.*

## Кароткі фэльетончык.

**...І печаць прылажыў.**

Сам пісар паехаў да земскаго, а яго «памагайла» — пісарчук сядзеў над кучай «прыказоў», кісла моршчыўся, пацягіваўся і зноў браўся за пяро і выводзіў строчкі. Посьле ўчэрайшаго хмеля шуміць у вушах і дрыжаць рукі. Хацелося б апахмеліцца, але як на зло, ніхто не прыходзіў да канцэлярыі і кішэнь пуставаў...

-- Пан старшына! Калі ласка, пастаў апахмеліцца... Нудзіць бяз конца...

— Дзе у мяне тые грошы?! Я сам ледзьве перэбіваюся!...

— Дапраўды, пане старшына, дай, што маеш...

Пажыч хоць, да заўтра!

— Іш які ты гіцэль! загуляць дык без мяне загуляў, а як на апахмелку — тады ужо да старшыны—«дай!..»

Ідзі да ўчэрашніх сяброў! —

Пісарчук паскрэбаў каля вуха і нічога не атказаў старшыне. Памачыў пяро у чарніла і задумаўся...

Дзень цягнуўся бяз конца доўга, а нуда ела вантробу.

---

і пашоў, а як ён атчыняў дзьверы, то ў хату убегла нешта белае, белае і знікло пад полам, Глядзіць Саўка на вокны, на каторых сьнег. Глядзіць на бацьку як ён робіць лапаць. Глядзіць і думае Думае, а на душы, у вуме нешта застаецца і застаецца..

І як не паважаць чэлавека, каторы пройдзе такі парог жыцьця!

### II Саўка вучыцца

Шпарка ідуць гады, не змігнеш вокам. Шпарка прайшлі і для Саўкі, калі ён быў маленькі. Але. во, яму матка ўжо сшыла штонікі з матузом, і першы раз у гэтай мужчынскай адзежы ён паехаў з бацькам на поле па ячмень. Цяпер Саўка ужо многа чаго ведае, ведае куды болей, чым іншы беленькі хлопчык, яго равесьнік. Саўка ведае дзе трэба шукаць гнёзды, Саўка умее ездзіць вярхом на кані, Саўка ведае дзе жыве дамовы і які ён ведае, дзе жыве Божэнька і дзе жывуць у раю дзеткі маленькіе, у каторых на галоўках вянкі с кветак. О, як многа ведае Саўка! І як ня ведаць: шасці гадкоў ён ездзіць ужо на начлег. Цэлу ночку ляжыць між таварышоў каля цяпла дзе небудзь на пожнях. Ляжыць, а абапал лес, рэчка, неба, на каторым блішчаць зоркі. Маладзік выскачыў з—за аблокоў, і зрабілося відна. Ціха, ціха. Нешта хрусціць... Гэта дровы, хворост на цяпле, а з рэкі паднімаецца нешта белае, і як дзяруга, вісіць над лазой, яварам. Іржэць дзесь-то конь, ў балоці шлёпаецца нешта і ўзноў усё робіцца ціха, ціха. Во тутака шмат чаго выснаваў Саўка з гамонак хлапцоў, убачыў пачуццём свайго сэрца, глядзя на прыроду. Саўка ездзіць ужо на працу у поле, ходзіць угумно скідываць з асеці жыта ціавёс, ганяе скаціну да пастуха, носіць палуднаваць, збірае зельле жывёлам, сьвіньням, пасець коніка і многа чаго іншаго робіць. Ен адзін ужо бегае у цёмны лес, дзе сабірае суравешкі, падасінавікі і баравікі ходзіць да рэчкі вудзіць рыбу. Яму мінуло восем гадкоў, а які працавіты ён хлопчык і рухмяны. Ешчэ на начлезі хлопцы гаварылі пра вучэньне, казалі, што карысна вучыцца, бо ў кнігах пра усё пішуць. І калі лежаў, у цёмну ночку Саўка каля цяпла, яму надта захацелося вучыцца, каб ведаць усё, — «Вун пакацілася зорка, кажуць што чэлавек памёр», —думае Саўка, а апасьля ешчэ думае, трэба вучыцца, бо ў кнігах недзе пра ўсё ёсць і пра зоркі... Моцна засела гэта думка у галаве Саўкі, яна не пакідала яго ні на часіну. І вось, як мінуло Саўцы восем гадкоў, тада ён пабег с хлопчыкамі у суседнюю вёску, дзе ёсць пачатковая школа, у каторай рахманая такая вучыцелька. «Як пекна ў школі» — казаў Саўка бацьку вярнуўшыся дамоў. — Што-ж там пекнаго»? пытае бацька, раскладаючы цяплоу а сеці І малы вучэнь апаведаў многа чаго пра вучыцельку, аб малюнках у кніжках.

...Саўка чытае ужо «букваря», пішэ і робіць задачы. Вучыцца дужа добра. — «Талань даў Пан Бог твайму Саўцы, казалі бабы Храсіні, а Саўка, ня слухаючы хваленьня баб, чытае з ахвоты і не адзін буквар, а другіе кніжэчкі, якіе яму давала вучыцелька. Адзінаццаці гадкоў Саўка акончыў пачатковую школку с «пахвальным».—«Куды далей?.. німа грошы...»—Думаў бацька і сын. Ужо малюсенькаму Саўцы упаўзла у галаву думка і умацавалася, што ён мужык, бедны мужык і яго жыцьцё — гэта араць, калі ёсць што, а калі німа, то ідзі да пана у батракі. Думку гэту яму перэдаў бацька. якому перэдаў яго бацька. Такіе самые думкі варушыліся у галовах дзядзькоў, суседоў і людзей з другіх вёсак. І толькі гэтые думкі выганялі ужо з яго галавы болі, ламаньне у косьцях ад працы, крыкі малых, галодных дзяцей, яго братоў, сьлёзы маткі, калі яе пабье пьяны бацька... О, многа чаго есь, што шчаміло дзяцінную душу, гаварыло нейкім іншым говарам, што гэта не так, што і яны людзі, што сонейко сьвеціць для усіх роўна І Саўка часта маліўся Богу, як малілася яго матка, бацька; ён прасіў Бога памагчы ім у беднасьці, прасіў адвучыць бацьку піць гарэлку, прасіў Міколу, Маці Божу... І чысты былі сьлёзы малюсенькаго, каторые выкідаў ён с самаго донышка сваей душы. Чысты. Найгорэй рабілося Саўцы, калі ён быў на сенажаці, ці пасвіў коніка, ці скародзіў. Уся прырода гаварыла пакуль што не застуджэнай, не засушэнай душэ Саўкі, што жыць дужа пекна. Смуціўся Саўка, але думка гаварыла яму, што ён селянін, а дзеля гэтаго трэба яму ждаць, што калісь усе яго пачуцьця будуць забрызганы рудой, засыпаны сьмяцьцём, крывёй, запечэно сонейкам, калі ён адвыкне жывіцца аднэй бульбай, навучыцца лаяцца і піць гарэлку...

Саўка кінуў чытаць кніжкі; негдзе было ўзяць ды і некалі. Ён думаў, якбы яму зарабіць на апратку. Тое самае думаў і бацька. Зямлі у Лапцёвых (так было іх прозвішчэ) ўсяго дзьве дзесяцінкі, ну дык ведама ім дваім не было што рабіць. Вось бацька, Петрык, і стаў шукаць, чэлавэка, катораму патрэбен быў бытрак—аддаў-бы Саўку, гэтак на год, рублёў за 15. — Дома што яму рабіць, лапці таптаць?.. а хлябец зьядзём і без яго, ёсць слава Богу каму...» І Петрык шукаў мейсца

| год | чысло кар | сумма штрафоў у рублях |
|---|---|---|
| 1906 | 16 | 15 525 |
| 1907 | 148 | 65.000 |
| 1908 | 120 | 82.000 |
| 1909 | 182 | 87.575 |
| 1910 | 243 | 60.150 |
| 1911 | 268 | 73.450 |
| 1912 | 317 | 96.800 |
| 1913 | 372 | 139.575 |
| Агулам | 1,666 кар. | 620.075 рб. |

З гэтай таблічкі відаць, што рэпрэсіі на друкі ані на адз н момэнт не спыняліся і у 1913 г. дайшлі найбольшаго развіцьця.

## З Беларусі і Літвы.

### З Міншчыны.

**Мінск.**

У Мінску цяпер выстаўка, арганізаваная Мінскім сельска гаспадарскім Таварыствам.

**Давідгарадок.**

У Давідгарадку на Палесьсі, Сельска-гаспадарскі Кружок аткрывае торговую школу з музэям і бібліотэку.

**З Амсціслаўшчыны.**

= На рэцы Вехры людзі бабра забілі і ў Амсціслаўля прадаваць жыдом прывязьлі. На таргу давалі 25 руб. А йспраўнік дачуўся і стражнікоў паслаў—Рыбаловоў забралі. І кажуць тут у нас людзі, суд на іх за бабра не абы які,: у вастрог на месяц ды грашмі 50 руб. заплаціць.

= Ня дужа даўно у Амсціслаўлі у трох зарэзалі аднаго па пьяному дзелу.

= Каля Шамова людзі жалюцца, што пісьмы не даходзюць.

*Г. Г.*

**Пажар.**

13 мая у Крайску узняўся пажар, каторы пры помачы вялікаго ветру зніштожыў 12 дамоў, у тым ліку воласць і жаноцкае вучылішчэ. Страт больш як на 12 тысяч рублёў У старшыны Руткоўскаго згарэло 300 руб. грошы, а у татарына аўчынніка згарэло 3,000 аўчын. Прычына—бабская неасцярожнасць с попелам

*Банадысь Таматэвіч.*

**Кухцічы** (Ігуменск. пав).

Ніўкога і нідзе мусі німа меней пашы і сенакосоў, як у нас, Кухцяноў. Затым у нас і ка ровы, як козы. Але-б і гэтые козы паздыхалі з голаду зімою, каб мы ураблялі толькі свой се накос. Нам трэба ешчэ, чуць не за дармна, нарабіць сена у памешчыка. Тамтэйшы памешчык мае многа і надта добраго сенакосу. Праз гэты сенакос нашы селяне не маюць супакою цэлую вясну. Каждую нядзельку, каждую свабодную часіну бягуць яны к пану камісару за сенакосам, а каб пан быў ласкавейшы дык нясуць яму яйкі. Камісар бачыць, што селянін галодны і дзярэ з яго апошнюю скуру. За якіх небудзь два маргі сенакосу ён бярэ адработку: зжаць морг жыта, ці аўса ды еш чэ дай яму два касцы і чатыры бабы, а за ўсю гэту працу селянін дастае чацьвёртую ці пятую часць с таго марга сена.

Добра, як павязе ешчэ пагода, а калі не, то і ўся праца прападзе марне. Да ўсяго гэтаго трэба дадаць, што сенакос пачынаецца у нас за тыдзень да Сёмухі, калі трава ешчэ гэткая, як валасы на галаве у якоча небудзь Паўлюка.

*Дзяцел.*

## З усіх старон.

**Чуткі аб роспуску Думы.**

У звязку с тым, што думская камісія адмовілася выдаць Карэнскаго, у бюрократычных кругах ізноў паднялі пытаньня аб роспуску Думы.

**Неспакой сярод работнікоў.**

18 мая у звязку с пачаткам у судзе справы абухоўскіх работнікоў былі вялікіе работніцкіе сабраньня на каторых было пастаноўлена забаставаць у знак пратэсту. У ночы перад гэтым паліція, як зазвычай перэд работніцкімі забастоўкамі, у работніцкіх слабодах размесціла коные паліцэйскіе патрулі. Многа паліцыі было у цэнтры гораду, каторая зраніцы прыпыніла ужо доступ работнікам у горад. баючыся дэмонстрацый. Работнікі з раніцой прыйшлі на работу, але пасьля са сьпеваньнем рэволюцыйных песень расхадзіліся. У іншых мейсцох грамадкі работнікоў хадзілі с чырвонымі сьцягамі. Баставало каля 100 тысяч работнікоў. На заводзі Эрыксона паліція разганяла работнікоў нагайкамі. Былі арэшты.

**Змены у міністрах.**

У тым тыдні разыйшліся чуткі, што міністр асьветы Кассо падаецца у адстаўку, што кандыдатам на яго мейсцо Мамонтава, каторы быў прэдседацелем на апошнім вучыцельскім зьезьдзі. Але с правіцельственных кругоў запэўняюць, што перамен ніякіх папуль што ня будзе.

**Перасяленьня патрыярха у Расею.**

С Канстантынопаля паведамляюць, што там нідаўна адбылося заседаньня сыноду, на каторым бытцым то ураджэна перэнясці разыдэнцію (мейсцо жыхарства) ўсесьветнаго праваслаўнаго патрыарха у Расею і даручыць Расеі-ж абарону хрысьціяноў-грэкоў.

**Обыскі і арэшты.**

У Пецярбурзі у ночы 24 і 25 мая адбылося многа обыскоў, найболей сярод работнікоў. Пры гэтым шмат арэштаваных.

**Валасное земство**

Правые члены Гас. Рады заявілі што яны прапусцюць закон аб валасных земствах, калі толькі будуць зроблены тые змены у законе якіе хочуць правые.

**Пурышкевіч працуе.**

Пурышкевіч пачынае усестароннае абсьледаваньня Расеі. З гэтай мэтаў ён разаслаў цыркуляр аддзелам саюзу рускаго народу, дзе просіць сабіраць весткі аб газэтных супрацоўніках, разсьледзіць прозвішчы тых, каторые заховываюцца пад псэўдонімамі. Далей ён просіць сабраць весткі аб тым, як адносіцца да саюзнікоў выжэйшая і ніжэйшая адміністрація, суд і духавенства.

**Дворяне „Філарэты“.**

Рада аб'еднанаго дваранства па просьбе Пурышкевіча радаіць прэдвадзіцелям дваранства запісываць у члены філарэтоўскаго таварыства і вясці агітацію каб запісываліся народные вучыцелі.

**Забастоўка керасіншікоў.**

З Баку пішуць, што забастоўка на керасінавых крыніцах усё разрастаецца. Цяпер бастуе 25,000 работнікоў.

**Скасаваньне «жуліка».**

Міністр грашавых спраў выдаў цыркуляр, па каторы с 1-то чэрвеня касуе прадажу у манапольках гарэлкі у малых бутэлечках—сотках.

Гэткім парадкам „жулік“ касуецца міністэрскім цыркулярам і гарэлку будуць прадваць толькі у поўбутэльках, бутэльках і гарцах. А са студня 1915 г. касуюцца і поўбутэлькі.

Рэдактар-Выдавец І Луцэвіч.




Не купляйце парашкоу (попелоу—штучных гноеу) абы дзе па крамках, а купляйце там дзе прадаюць за справедлівую цэну добры тавар

у складзі **Віленскаго Таварыства Сельскай гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

Купляйце хаурусна цэлымі вагонамі, тады абыходзіцца найтаней.

Там же можна купляць усякую гаспадарскую прыладу.

!: Апошняе напомненьне !!

**Даступна кожнаму**

**купіць вучастак зямлі у ЗВЯРЫНЦЫ** у самай лепшай часці гор. Вільні. Мейсцовасць прыгожая, здаровая, лес, рэка. **Цэны і варункі выгодные. С купляй паспешайця,** зямлі асталася зусім мала! **РУПЦЕСЯ — купіць можэця толькі у гэтым сэзоне.** Па спраўкі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня **„Звярынец“**, Георгіеўскі праспэкт, д. № 68. Тэл. № 46. **Спраўкі выдаюцца праз цэлы дзень, не вылучаючы і сьвят.**

**Беларуская Кнігарня**

**Вільня, Завальная 7.**

**Прадае толькі што надрукаваные кніжкі:**

1) „Вялікодная Пісанка“ зборнік розных аўтороў, 80 стр. цэна . . . . . . . . . . 25 к.
2) „Васількі“ Ядвігіна Ш. 120 стр. ц. . . . . . . 30 к.
3) „Ня ўсёж разам ягомосці“ Я. Лёсіка, 32 стр. ц. . 5 к.
4) „Apawiedannia i lehiendy wieršam“ зборнік розных аўтороў, 96 стр. ц. . . . . . . . . 25 к.
5) „Сыгнал“ Усевалода Гаршына 22 стр. ц. . . . . . 5 к.

**3-ці год выдавецтва**

**„САХА“**

**Першы сельска-гаспадарскі Беларускі Месячнік.**

„Саха“ на Віленскай гаспадарскай выстаўцэ у 1912 гаду за стацьці свае атрымала срыбны мэдаль.

Падпісная цэна с перасылкай: на 1 год—1 руб. 20 к.; на 6 м.—60 к. Цэна асобнай кніжкі 8 кап. с перасылкай 10 кап.

Гадавые падпісчыкі «Сахі» дарма атрымаюць выпрабаваные найлепшые гатункі насеньня збожжа па 4 лоты. Але калі падпісчык, ці яго знаёмы (па яго просьбе) зойдзе сам у рэдакцію, то можэ атрымаць больш гатункоў насеньня.

Апрача таго Рэдакція дарма выдаець на мейсцы ў Мінску сваім гадавым падпісчыкам прышчэпкі фруктовых дрэў пэўных тутэйшых гатункаў. Яблыні: Антоноўка, Рэнэта летняя і папероўка; ігрушы: асеньня Вінёўка і раньняя «Бураковая» (сама ігрушка зьверху і ў сярэдзіне зусім чырвоная).

Адрэс Рэдакціі: Мінск Александроўская вул. № 25.

**Рэдактор-Выдавец А. Уласоу.**

**Падпіска прымаецца с кожнаго месяца.**

„Саха“ і „Лучынка“ разам на 1 год—3 рублі.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.